КАНГРЭГАЦЫЯ БОЖАГА КУЛЬТУ
І ДЫСЦЫПЛІНЫ САКРАМЭНТАЎ

Прат. № 156/20

# ДЭКРЭТ

## адносна Імшы падчас пандэміі

*Не будзеш баяцца заразы, што ходзіць у змроку* (пар. Пс 91[90], 5-6). Гэтыя словы псальмісты заахвочваюць захоўваць вялікі давер да любові Бога, які ніколі не пакідае свой народ у час уціску.

У гэтыя дні, калі вірус COVID-19 цяжка ахапіў увесь свет, у Дыкастэрыю пастуціла шмат просьбаў дазволіць цэлебраваць адмысловую Імшу з просьбай да Бога пакласці канец гэтай пандэміі.

Таму Кангрэгацыя згодна з паўнамоцтвамі, дадзенымі ёй Найвышэйшым Пантыфікам Францішкам, дазваляе цэлебраваць Імшу падчас пандэміі ва ўсе дні, акрамя ўрачыстасцяў, нядзель Адвэнту, Вялікага посту і Вялікадня, дзён актавы Пасхі, Успаміну ўсіх памерлых вернікаў, Папяльцовай серады і дзён Вялікага тыдня (пар. *Агульныя ўводзіны да Рымскага Імшала*, № 374), пакуль будзе працягвацца пандэмія.

Фармуляр Імшы прыкладаецца да гэтага дэкрэта.

Усе іншыя супярэчныя пастановы не маюць моцы.

У сядзібе Кангрэгацыі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў,

30 сакавіка 2020 г.

Кардынал Роберт Сара
*Прэфект*

✠ Артур Рош
*Арцыбіскуп Сакратар*